■ Педсавет

# ЦІ ВЫРАСТУЦЬ КРЫЛЫ Ў ВУЧНЯЎ?

## Міжнародныя педагагічныя чытанні — упершыню ў нашай краіне

**«Які настаўнік скардзіцца на гіперактыўных дзяцей? Толькі гіперпасіўны... Гіперактыўным дзецям патрэбныя гіперактыўныя настаўнікі і гіперактыўныя бацькі. Таму мы проста абавязаны вырасціць у сабе настаўніка XXI стагоддзя, інакш затармозім дзяцей у іх развіцці», — гэта думка належыць ганароваму прэзідэнту Міжнароднага цэнтра гуманнай педагогікі, акадэміку Расійскай акадэміі адукацыі Шалве АМАНАШВІЛІ. Упершыню ў нашай краіне на базе БДПУ прайшлі Міжнародныя педагагічныя чытанні, якія сабралі таленавітых педагогаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Казахстана, Грузіі і Азербайджана.**

Між іншым, гэта ўжо шаснаццаты падобны форум. Першыя Міжнародныя педагагічныя чытанні адбыліся ў 2002 годзе ў Маскве. Пазней яны неаднаразова праходзілі ў Расіі і Грузіі. Тэму для форуму «Палюбіце будучыню — крылы вырастуць» прапанаваў Шалва Аманашвілі. Ён жа і стаў вядучым чытанняў.

— Нельга дзяліць дзяцей на добрых і дрэнных, на разумных і неразумных. Гэта не дзіця адстае ў развіцці, а ты адстаў ад педагогікі. І будучыню ты не любіш, — дзяліўся думкамі з калегамі і студэнтамі Шалва Аманашвілі падчас свайго майстар-класа. — Трэба ганарыцца слабымі, якія дзякуючы табе сталі моцнымі. Каб ганарыцца таленавітымі, асаблівага розуму не трэба. Дзяцей трэба любіць, іх трэба натхняць! Ці можна ўявіць сабе школу без сэрца, школу, у якой настаўнік не гарыць як свечка? Нашы вучні — не камп'ютары, у якія можна закласці мегабайты ведаў і выпусціць іх у жыццё. Настаўнік не можа быць проста ўрокадаўцам. Маральнасць не выхоўваецца аднымі словамі...

«У кожнага дзіцяці з нараджэння ёсць свая місія. І яму патрэбна свабода. «Палюбіце будучыню — крылы вырастуць!» Палюбіць будучыню? Што гэта значыць? — разважаў Шалва Аманашвілі. — Якія крылы? І навошта яны нам? Што мы з імі будзем рабіць? А навошта нам дзеці без крылаў? Як яны змогуць змяніць свет да лепшага?»

Шалву Аманашвілі называюць настаўнікам ад Бога. Яго галоўная педагагічная ідэя — прыняцце любога вучня такім, які ён ёсць. Аманашвілі заклікае на першае месца ставіць выхаванне і сцвярджае, што дабрыня памнажаецца дабрынёй, шчырасць — шчырасцю, радасць — радасцю. Кожнаму педагогу ён дапамагае ўсвядоміць высокую місію сваёй прафесіі.

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, прафесар Аляксандр ЖУК** уручыў славутаму педагогу «педагагічны Оскар» — статуэтку, якая ўяўляе сабой копію скульптуры, прысвечанай першай настаўніцы. Яна была ўстаноўлена на ўваходзе ва ўніверсітэт напярэдадні святкавання векавога юбілею гэтай установы і ўжо паспела стаць славутасцю.

**«Трэба ганарыцца слабымі, якія дзякуючы табе сталі моцнымі. Каб ганарыцца таленавітымі, асаблівага розуму не трэба».**

— «Педагагічным Оскарам» мы адзначаем нашых найлепшых студэнтаў і тых людзей, якія ўносяць істотны ўклад у развіццё педагагічнай адукацыі, — растлумачыў Аляксандр Жук. — Дэвіз БДПУ — «Будучыня пачынаецца тут», што вельмі блізка да тэмы педагагічных чытанняў. Мяркую, усе разумеюць, што на педагагічную адукацыю ў сучасных умовах ускладаецца асаблівая задача: ад таго, якога педагога мы падрыхтуем сёння, залежыць заўтра нашых краін. Але, акрамя ведаў і прафесійных уменняў, мы павінны закласці ў нашых выхаванцаў яшчэ і глыбокія маральныя арыенціры. Такія чалавечныя якасці, як міласэрнасць, дабрыня, цярплівасць, любоў да бліжняга, я лічу абавязковымі для будучых педагогаў, бо, перш чым выхоўваць і вучыць дзіця, яго трэба палюбіць.

Рэктар расказаў, што ў валанцёрскіх аб'яднаннях добраахвотна займаюцца каля 1300 студэнтаў педагагічнага ўніверсітэта. Валанцёрскай дзейнасці тут нададзены статус валанцёрскай практыкі, якая рэалізуецца для студэнтаў ужо з першага курса на базе розных устаноў: школ-інтэрнатаў, прытулкаў, цэнтраў рэабілітацыі і іншых.

— Актыўны ўдзел студэнтаў у валанцёрскай дзейнасці спрыяе фарміраванню ў іх не толькі прафесійных кампетэнцый, але і актыўнай грамадзянскай пазіцыі, развіццю духоўна-маральных і гуманістычных каштоўнасцяў, засваенню найважнейшага сацыяльнага досведу, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — За актыўнае развіццё і папулярызацыю валанцёрскага руху сярод студэнцкай моладзі калектыў універсітэта быў адзначаны сёлета дзяржаўнай прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне», якую мы перадалі Крывіцкаму спецыяльнаму лячэбна-выхаваўчаму прафесійна-тэхнічнаму вучылішчу закрытага тыпу.

— Мы ўсе цудоўна разумеем, што нельга нашпігаваць дзіця ведамі, якіх яму хопіць на ўсё жыццё, таму што аб'ём ведаў пастаянна павялічваецца. Але сфарміраваць асобу, грамадзяніна, сем'яніна школа можа і яна абавязана гэта рабіць, — лічыць **намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА**. — Нельга раздзяляць навучанне і выхаванне. Не можа настаўнік проста прыйсці на ўрок і даваць сваім вучням толькі веды. На ўроку мае значэнне ўсё: інтанацыя настаўніка, яго ўсмешка, яго жаданне ўзаемадзейнічаць з вучнем. І выхоўвае зусім не лекцыя, а ўсяго адна, але сказаная своечасова, фраза. Сёння мы кажам пра тое, што кожны ўрок павінен праходзіць у атмасферы інтэлектуальных, маральных і эстэтычных хваляванняў, сутыкненняў розных пунктаў погляду і меркаванняў, пошуку праўды і магчымых шляхоў вырашэння праблемы. І нявважна, які прадмет выкладае настаўнік: галоўнае — якія ўмовы ён стварае на сваіх уроках для гарманічнага выхавання асобы. Ідэі гуманнай педагогікі павінны быць закладзены ва ўсе нашы праграмы і нашы падручнікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Дождж з мокрым снегам

### А ўначы сіноптыкі прагназуюць замаразкі да мінус 6 градусаў

**На гэтым тыдні ў краіне чакаецца няўстойлівае надвор'е, калі сонечныя дні будуць чаргавацца з пахмурнымі і дажджлівымі, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**

Уначы ў сераду месцамі да мінус 6 градусаў. Удзень амаль паўсюдна прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Тэмпература паветра — 2—9 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах уначы плюс 1—4 градусы, а ўдзень — 10—15 цяпла. Дождж з мокрым снегам будзе ісці паўсюдна і ўначы ў чацвер. А вось удзень толькі па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі. Уначы ад мінус 4 градусаў па поўначы да плюс 5 градусаў па поўдні, а ўдзень будзе 2—8 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў.

Чарговая хваля атмасферных франтоў завітае да нас у пятніцу. Таму кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу ўначы будуць назірацца пераважна на заходняй частцы, а раніцай і ўдзень ужо на большай частцы тэрыторыі краіны. Чакаецца, што ўначы і раніцай падмарозіць, таму на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, а ўдзень будзе 2—9 цяпла. Па паўднёвым захадзе краіны ўначы 1—6 цяпла, удзень — плюс 10—15 градусаў.

У першыя дні красавіка да нас завітае сапраўднае веснавое цяпло. З паўднёвага захаду Еўропы да нас пачне паступаць цёплае паветра і тэмпературны фон павысіцца. У асобных раёнах, пераважна ў паўночнай частцы краіны, не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Тэмпература паветра ўначы ў суботу складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, а па паўднёвым захадзе будзе нават не ніжэйшая за плюс 5—8 градусаў. Удзень будзе ў асноўным 11—18 цяпла, але па паўночным усходзе толькі каля плюс 5—10 градусаў. У нядзелю стане яшчэ цяплей, калі ўначы будзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, а ўдзень увогуле чакаецца 14—20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ЭХ, ХАЧУ БЯРОЗАВІКУ, ДЫ З МАЦЯРДУШКАЙ!

**Сёлета ў Беларусі плануецца нарыхтаваць і перапрацаваць каля 13 тысяч тон бярозавіку. На сённяшні дзень сабрана ўжо каля 10 тысяч тон, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

Спецыялісты адзначаюць, што працягласць і паспяховасць нарыхтоўчага сезона напрамую залежыць ад умоў надвор'я, і рэзкае пацяпленне можа значна скарэкціраваць планы нарыхтоўшчыкаў. Напрыклад, прадпрыемствы Брэсцкай вобласці, дзе тэмпература паветра пайшла ўверх раней, чым у іншых рэгіёнах, збор соку ўжо завяршаюць, а ў Віцебскай прыступілі толькі на мінулым тыдні.

Сёння беларускія прадпрыемствы могуць вырабляць каля 40 найменняў сокаў на аснове бярозавіку. Акрамя непасрэдна бярозавага з цукрам выпускаюцца напоі з даданнем сокаў розных культурных і дзікарослых ягад, з настоямі лекавых траў — мацярдушкі, кветак ліпы, рамонку, мелісы і інш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПАМОЧНІЦА БАБЫ МАШЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пасля бальніцы было вельмі цяжка, я чатыры месяцы амаль не адыходзіла ад яе, — уздыхае Ніна Лубоўская, — вельмі ж яна была слабая, зараз ёй значна лепш, памяць вярнулася. Пасля сістэматычных трэніровак маторыка рук аднавілася. А цяпер, з надыходам вясны, мая баба Маша яшчэ і памаладзела...

Трэба сказаць, што Ніна ніколі не апускала рук, хоць за некалькі гадоў да пенсіі засталася без работы. Але сядзець без справы не стала. У цэнтры занятасці ацанілі яе камунікабельны характар і прапанавалі звярнуцца ў аддзяленне сацыяльнай дапамогі дома, якое створана ў структуры Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тут яе і афармілі сядзелкай да 90-гадовай Марыі Аўдзеевай, суседкі па ваенным гарадку.

— Людзям патрэбна такая дапамога, бо часам пра іх няма каму паклапаціцца, — расказвае Ніна Лубоўская, — некаторых сваіх падапечных я прымала з абвостранымі формамі нервовых зрываў, дэпрэсіямі. Асабліва складана з тымі, каго кінулі дзеці. З адзінокімі лягчэй, яны больш спакойныя.

Ніна Лубоўская стараецца падтрымліваць адносіны з роднымі сваіх падапечных, але не ўтойвае, што можа і ў суд на некаторых падаць за тое, што не дагледзяць сваіх састарэлых бацькоў. Яна лічыць, што нельга іх на адных сацыяльных работнікаў кідаць.

У цэнтры сацыяльнага абслугоўвання расказалі, што працоўны дзень сядзелкі доўжыцца 4 гадзіны. Паслугу можна назваць даступнай, бо на месяц кошт за яе складае 42 рублі, субота і нядзеля — выхадныя. Можна скарыстацца дзвюма гадзінамі на дзень, тады і аплата будзе ўдвая меншая.

— Сядзелка дапамагае як у медыцынскім, так і бытавым плане, — тлумачыць **загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Гродзенскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Валянціна КАСКЕВІЧ.** — Яна павінна і цiск памераць, і лекі даць, і аказаць дапамогу ў асабістай гігіене, у прыёме стравы, замяніць бялізну і іншае.

Ніна Лубоўская працуе сядзелкай ужо год. Акрамя гэтага, аказвае паслугі іншым жанчынам-пенсіянеркам. Задаволена, што знайшла працу, якая прыносіць карысць іншым. Асабліва ганарыцца поспехамі бабы Машы і марыць адзначыць яе стогадовы юбілей.

— Бабуля спажывае разнастайную ежу, заўсёды ёсць садавіна, мяса, тварог. У нас шмат нарыхтавана кансерваў, замарожаных ягад. Зараз ёй амаль 92 гады, а яна без акуляраў чытае, цікавіцца навакольным жыццём... — кажа Ніна Лубоўская.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

❍ У ТЭМУ

**У краіне, згодна з данымі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на пачатку года такую дапамогу атрымліваюць 90 тыс. чалавек. Большасць з іх — жыхары аддаленых вёсак, а кожны трэці атрымальнік паслугі мае ўзрост за 80 гадоў.**

❍ КАМПЕТЭНТНА

**Вольга СЯДЗЕЛЬНІК, намеснік начальніка аддзялення сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама:**

— У Гродзенскай вобласці новыя стаўкі сядзелак уводзяцца сістэматычна. Так, у Гродзенскім раёне толькі за два месяцы для гэтай катэгорыі сацыяльных работнікаў створана 10 працоўных месцаў. А ўсяго ў вобласці амаль 150 сядзелак, дапамагай якіх карыстаюцца 286 чалавек. Дома атрымліваюць дапамогу 13 тысяч грамадзян сталага ўзросту, інваліды першай і другой груп.


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ

**28 апреля 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске**

| | | |
|---|---|---|
| **Наименование объекта** | Изолированное помещение с инв. №130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех» | Капитальное строение с инв. №130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий» |
| **Номер лота** | 1 | 2 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У |
| **Тип помещения** | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| **Общая площадь (кв. м)** | 12954,0 | 1930,1 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | | 0,3941 |
| **Начальная цена продажи, рублей** | 583 984,35 | 3 071 688,30 |
| **Сумма задатка, рублей** | 58 398,45 | 307 168,83 |
| **Затраты на оценку, организацию и проведение аукциона, рублей** | | 1498,71 |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| **Сведения об объекте** | Одно- и двухэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов с бетонным покрытием 3051,3 м², сушильные камеры – 6 шт., навес – 72 м², циклоны – 3 шт., помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, асфальто-бетонное и бетонное покрытие – 4979 м², электрический кабель – 96,7 м, ливневая и фекальная канализации – 203,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г. | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 м², помещение ремонтно-механического участка – 294 м², помещение цеха доборных изделий – 1456 м², пристройка – 12 м², навес – 24 м², градирня – 33 м², два теневых навеса – 7м². Покрытие бетонное – 1030 м². Ввод в эксплуатацию – 1970 г. |
| **Организатор аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | |
| **Продавец аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | |

Аукцион состоится **28 апреля 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление, код 401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 27 апреля 2017 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.
5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2, с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 27 апреля 2017 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66.**

**Контактный телефон 375 29 640-80-37**